**Сосна, К.** Узнагароджаны медалём «За адвагу» / К. Сосна // Кліч Радзімы (Шаркаўшчына). — 2013. — 23 лют. — С. 1.

## УЗНАГАРОДЖАНЫ МЕДАЛЁМ «ЗА АДВАГУ»

15 лютага ў раённым цэнтры прайшло мерапрыемства, прысвечанае Дню памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў, на якім прысутнічаў і Антон Вацлававіч Паўловіч з адкрытага акцыянернага таварыства «Буеўшчына».

Мінула ўжо больш за 20 гадоў з тых жудасных падзей, якія пеажылі маладыя хлопцы, аднак памяць сэрца не дае забыцца пра іх, Антон Паўловіч разам з аднавяскоўцам з Іёдаў Віктарам Дземідовічам у 1980 годзе былі прызваны на тэрміновую воінскую службу. Нават і не думалі аб тым, што трапяць так далёка, аж у Туркменію. Пасля паўтарамесячнай перападрыхтоўкі землякі былі накіраваны ў правінцыю Газні, якая размешчана ў 150 кіламетрах ад Кабула. Антон Вацлававіч быў вадзіцелем бронетранспарцёра. Два гады знаходзіўся ў афганскім пекле, выконваючы свой воінскі абавязак.

За храбрасць і мужнасць, праяўленыя ў час службы, А. В. Паўловіч узнагароджаны медалём «За адвагу».

Вярнуўшыся ў родную вёску, былы салдат заняўся мірнай працай. Ажаніўся на вясковай прыгажуні. Выхавалі двух сыноў. Яўген працуе майстрам у Шаркаўшчынскай ПМС, мае сваю сям'ю. Павел – трэнер дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы ў райцэнтры.

Сам Антон Вацлававіч – перадавы механізатар у гаспадарцы. Працуе на трактары К-701 з пагрузчыкам. Чалавек вельмі запатрабаваны ў сельгаспрадпрыемстве. Асабліва ў гэтую снежную зіму, калі кожны дзень ён задзейнічаны на расчыстцы дарог ад снегу, пагрузцы кармоў на трактарныя прычэпы. Сціпласць, добрасумленнасць, працавітасць вызначаюць А. В. Паўловіча, бо ён добра ведае кошт жыццю і цэніць кожнае яго імгненне.

**К. Сосна**